ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 277 (1244) | ПАНЯДЗЕЛАК, 1-га сьнежня 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . . 30 кап.
3 месяцы . . . . 90 "
6 месяцаў . . . 1 р. 80 "
1 год . . . . 3 р. 30 "
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25,
сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Кошт асобнага № — 2 кап.

УСІМ РК ЛКСМБ

Мобілізацыя комсамольцаў для стварэньня сталых кадраў на лесазагатоўках не ажыцьцёўлена. Усю організацыю пераключыць на лесазагатоўкі. Вывазку лесу—пад адказнасьць сэкратароў. Забясьпечыць выкананьне дырэктыў, інформуйце ЦК аб выкананьні к 5 сьнежня.

ЦЭКАМОЛ—РЫНДЗІЧ.

ПОЎНАЕ ВЫКАНАНЬНЕ ФІНПЛЯНУ—

НАШ АДКАЗ КОНТРРЭВАЛЮЦЫЯНЭРАМ-ШКОДНІКАМ

1 СЁНЬНЯ ПАЧЫНАЕЦЦА ЎДАРНЫ ДЗЕСЯЦІДЗЁНЬНІК МОБІЛІЗАЦЫІ СРОДКАЎ НАСЕЛЬНІЦТВА 10

КОМСАМОЛЬСКУЮ ІНІЦЫЯТЫВУ—НА ФІНАНСАВЫ ФРОНТ

Пастанова бюро ЦК ЛКСМБ

па дакладу НКФіну, кіраўніцтва ашчадкасамі БССР і адкрытаму лісту ячэйкі ЛКСМБ ашчадкас г. Менску аб мобілізацыі сродкаў насельніцтва ад 27-XI-30 г.

1. Задача забясьпечаньня програмы соцыялістычнага будаўніцтва ўдарнага кварталу фінансавымі сродкамі патрабуе сконцэнтраваньня ўвагі ўсёй грамадзкасьці на пытаньні мобілізацыі сродкаў. Неабходна забясьпечыць поўнае выкананьне квартальнага заданьня і ў бліжэйшы час компэнсаваць недавыкананьне заданьняў кастрычніка і лістапада месяцаў.

2. Удзел комсамольскай організацыі кампаніі мобілізацыі сродкаў лічыць усім недастатковым і катэгарычна прапанаваць раённым камітэтам ЛКСМБ пытаньне мобілізацыі сродкаў паставіць, як адно з важнейшых мерапрыемстваў працы комсамольскай організацыі.

3. Зьвярнуць асаблівую ўвагу на активізацыю працы вясковых ячэек у гэтай галіне, РК ЛКСМБ накіраваць на вёску комсамольцаў для праведзеньня кампаніі па мобілізацыі сродкаў.

На час абвешчанага ЦК КП(б)Б ударнага 10-цідзёньніка (1-10-12) мобілізацыі сродкаў, абвясьціць усе комсамольскія ячэйкі мобілізаванымі на праведзеньне дзесяцідзёньніка.

4. Стварыць ударныя брыгады з комсамольцаў для збору вызначаных законам плацяжоў і праверкі выкананьня дырэктыў па справе мобілізацыі сродкаў у напрамку:

а) поўнага выкананьня ўсіх абавязковых плацяжоў (сельгаспадатак, страхоўка, самаабкладаньне);

б) выкананьня заданьня па падпісцы на пазыку „Пяцігодка—ў 4 гады" і поўнага афармленьня падпіскі колгасамі і аднаасобнікамі;

в) уцягненьня ўкладчыкаў у ашчадкасы разгортваньня безпаяўных укладаў і інш.;

г) збору паёў у спажывецкую і асабліва сельска-гаспадарчую кооперацыю;

д) выкананьня дырэктыў па сконцэнтраваньню ўсіх грашовых сродкаў вёскі (розныя плацяжы насельніцтва, выручка кооперацыі) у крэдытных установах;

е) выкананьня дырэктыў аб прасоўваньні на вёску комэрцыйнага цукру і інш. прам. тавараў.

6. Прапанаваць райкомам, выходзячы з дырэктыў ЦК КП(б)Б па пытаньню мобілізацыі сродкаў, праводзіць сталы нагляд і непасрэднае кіраўніцтва працай комсамольскіх ячэек у гэтай справе, заслухоўваючы даклады ячэек.

7. Улічваючы адказьнейшае месца ашчадкас у агульным фінпляне, мобілізацыя сродкаў ашчадкасы набывае вялікае значэньне.

Стан выкананьня фінпляну ашчадкас за кастрычнік і лістапад месяцы сьведчыць аб наяўнасьці сур'ёзьнейшых прарываў у гэтай галіне, што патрабуе мобілізацыі ўвагі ўсёй комсамольскай організацыі вакол задач і працы ашчадкас і разгортваньня ашчадсправы.

8. Констатаваць, што дырэктывы, даныя ЦК ЛКСМБ, і ўзятыя абавязательствы па соц. дагавору з ЦК комсамолу Грузіі па рэалізацыі вэлёабавязательстваў Беларускай комсамольскай організацыяй—ня выкананы. РК і нізавыя ячэйкі комсамолу не праявілі належнай ініцыятывы і масавасьці вакол выкананьня соцумовы і дырэктыў ЦК.

9. Ухваляючы прапановы комсамольскай ячэйкі ашчадкас г. Менску, накіраваныя на ўцягненьне ў актыўную працу па выкананьню фінпляну комсамольскай організацыі, бюро ЦК ЛКСМБ пастанаўляе:

1. Улічваючы цесную сувязь працы ашчадкас з грамадзкасьцю і асноўны прынцып яе працы—добраахвотнасьць, шырока падтрымліваць і пашыраць ініцыятыву нізавых організацый па шэфству комсамолу над ашчадкасамі, забясьпечыўшы гэтае шэфства практычным удзелам комсамолу ў рабоце ашчадкас і разгортваньні ашчадсправы (ударныя брыгады, організацыя падворных абходаў, актывізацыя працы нізавых камсадаў, організацыя актыву вярбоўшчыкаў, актыву агітатараў і інш.);

2. **Організаваць да X зьезду ЛКСМБ 10 комсамольскіх аддзяленьняў ашчадкас, забясьпечыўшы пастаноўку прыкладнай працы гэтых аддзяленьняў. Адначасова ўзмацніць працу існуючых комсамольскіх аддзяленьняў ашчадкас;**

3. Высунуць 200 комсамольцаў з рабочай, колгаснай і бядняцка-серадняцкай моладзі на працу ў нізавы ашчадапарат. Кіраўніцтву ашчадкасамі забясьпечыць падрыхтоўку іх праз курсы;

4. Прапанаваць РК, ГК і ячэйкам прадпрыемстваў, якія шэфствуюць над ашчадкасамі, паставіць на практычныя рэйкі гэтае шэфства шляхам удзелу ў штодзённай працы ашчадкас (праверка працы, заслухоўваньне справаздач, ініцыятары ашчадсправы на прадпрыемствах, поўны ахоп бюджэту працоўных ашчадкасамі і інш.);

5. Праводзячы шырокую агітацыйна-растлумачальную працу сярод працоўных аб уцягненьні ўкладчыкамі ашчадкас, ахопу пазыкай, карыстаньні безнаяўнымі разьлікамі, пашырэньні мэтавых накапленьняў і інш., дабіцца 100 проц. ахопу комсамольцаў ашчадкасамі і правядзеньня бюджэту праз ашчадкасы пад лёзунгам „Кожнаму комсамольцу—ашчадную кніжку";

6) **Мобілізаваць рабселькораў-комсамольцаў і лёгкую кавалерыю на барацьбу з бюрократызмам і цяганінай, як у самым ашчадным апараце, гэтак і з боку мясцовых органаў у адносінах да ашчадных кас, а таксама прыцягнуць іх да справы палепшаньня работы ашчадапарату і актывізацыі іх на працу па разгортваньню ашчадсправы;**

7. Узяўшы абавязацельства актыўнага і практычнага ўдзелу комсамолу Беларусі ў галіне працы ашчадкас і разгортваньня ашчадсправы, ЦК ЛКСМБ выклікае на соцспаборніцтва комсамольскую організацыю Украіны, на лепшае правядзеньне гэтай працы і даручае масава-экономічнаму сэктару ЦК да 1-XII распрацаваць проэкт соц. умовы. Социялістычны дагавор шырока абгаварыць комсамольскім організацыям з удзелам працоўнай моладзі.

Адначасова разгарнуць соцыялістычнае спаборніцтва паміж раёнамі і нізавымі комсамольскімі організацыямі на лепшае разгортваньне ашчадсправы і выкананьне соцдагавору з комсамолам Украіны;

8. Для ўдзелу ва ўсёй працы мобілізаваць піонэрскую організацыю і прапанаваць ЦБ ДКА да 1-XII выпрацаваць конкрэтныя мерапрыемствы па ўдзелу піонэраў у галіне мобілізацыі сродкаў насельніцтва;

9. Паслаць 3 ударныя брыгады ЦК ЛКСМБ для правядзеньня кампаніі мобілізацыі сродкаў па асоба-адстаючых раёнах;

10. Прапанаваць рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена" шырока асьвятляць удзел комсамолу ў мобілізацыі сродкаў насельніцтва і разьвіцьці ашчад справы.

Комсамол—на фінансавы фронт

Верасьнёўская адозва ЦК УсеКП(б) і ЦК УсеЛКСМ патрабуе мобілізацыі сіл і сродкаў працоўных на выкананьне „Пяцігодка—у 4 гады".

Фінпляя, які павінен забясьпечыць выкананьне пляну вялікіх работ, патрабуе асаблівай увагі і практычнага ўдзелу комсамолу ў яго выкананьні.

Улічваючы адказьнейшае месца ашчадкас у мобілізацыі вольных сродкаў працоўнага насельніцтва, комсамол Беларусі павінен з усёй настойлівасьцю і комсамольскім энтузіязмам дабівацца разьвіцьця ашчадсправы і прасоўваньня яе ў працоўныя масы.

Узятыя ЦК комсамолу обавязацельствы ў галіне мобілізацыі сродкаў праз ашчадкасы могуць быць ажыцьцёўлены толькі пры масавым удзеле ў гэтай справе кожнай комсамольскай ячэйкі і кожнага комсамольца.

Організацыяй шэфства нізавых комсамольскіх ячэек над ашчадкасамі, вылучэньнем лепшых комсамольцаў у ашчадны апарат, разгортваньнем соцспаборніцтва, стварэньнем грамадзкой думкі вакол ашчадсправы паставім на практычныя рэйкі ўдзел комсамолу ў выкананьні фінпляну ашчадкас.

Ленінскі комсамол—на фінансавы фронт, на выкананьне фінпляну!

Сэкратар ЦК ЛКСМБ **Палякоў.**

Падтрымаць ініцыятыву комсамолу ў галіне мобілізацыі сродкаў

Апошні Пленум ЦК КП(б)Б абавязвае ўсе партыйныя і савецкія організацыі прыняць самыя рашучыя захады да поўнага выкананьня фінпляну.

Гэтае рашэньне пленуму ЦК патрабуе паставіць фінансавае пытаньне ў цэнтр увагі ўсёй партыі.

Ленінскі комсамол—ударная брыгада на соцыялістычным фронце павінен прыняць актыўнейшы ўдзел у выкананьні дырэктыў партыі ў галіне мобілізацыі сродкаў.

Ініцыятыва комсамолу Беларусі ў галіне мобілізацыі сродкаў і разгортваньня ашчадсправы павінна сустрэць актыўную дапамогу з боку ўсіх партыйных і комсамольскіх організацый.

Упартай работай комсамолу і сыстэматычным практычным удзелам у працы ашчадкас, даб'емся набліжэньня ашчадапарату да працоўных і прасоўваньня ашчадсправы ў быт працоўных.

Організаваць гэтакую вялікую справу і штодзённа правяраць выкананьне ўзятых на сябе абавязкаў —важнейшая ўмова пасьпяховага вырашэньня гэтай адказнай задачы.

Старшыня ЦКК НК РСІ
Калнін.



Комсамольскае аддзяленьне ашчадкасы ў Менску

Выканаць фінплян ударнага кварталу

Фінплян асобага кварталу павінен забясьпечыць выкананьне прамплану гэтага кварталу і ўзмацніць фінансавую базу трэцяга, рашаючага году пяцігодкі.

Нажаль, да гэтага часу фінансавыя пытаньні не занялі належнага месца ў штодзённай працы саветаў і выканкомаў БССР.

Ашчадныя касы, на якія непасрэдна ўскладзены ўрадам задачы мобілізацыі вольных сродкаў працоўных і праца якіх цесна зьвязана з грамадзкасьцю, патрабуюць сталай увагі і штодзённай дапамогі з боку ўсёй савецкай грамадзкасьці.

Пры гэтым нездавальняючае становішча ашчадсправы на вёсцы патрабуе з боку мясцовых савецкіх органаў асаблівае ўвагі з мэтай ахопу ашчадкасамі шырокіх мас працоўнага сялянства.

Пачын Ленінскага комсамолу Беларусі ў шырокім разьвіцьці ашчадсправы павінен быць падтрыманы ўсёй савецкай грамадзкасьцю.

Райвыканкомы, гарсаветы, сельскія і местачковыя саветы, камісіі садзейнічаньня дзяржкрыту і ашчадсправе павінны шырока скарыстаць ініцыятыву і энтузіязм комсамолу і супольна з ім забясьпечыць поўнае выкананьне фінпляну ашчадкас.

Выкананьнем фінансавага пляну дамо адказ ворагам-шкоднікам і забясьпечым яшчэ больш пасьпяховае будаўніцтва соцыялізму ў нашай краіне.

А. Хацкевіч.

ДАЦЬ МЭТАЛЬ КРАІНЕ

З 1-га па 10-е XII абвешчана дэкада збору мэталялому

Сёньня пачынаецца ўсебеларуская дэкада збору мэталялому. Правядзеньне гэтай дэкады выклікана тым, што наша прамысловасьць на працягу другога году пяцігодкі недавыпрацавала 500.000 тон мэталю, што стварае вялікія цяжкасьці ў справе забясьпечаньня краіны.

Уперадзе—3-ці год пяцігодкі. Год, які павінен быць рашаючым годам. Годам бальшавіцкага наступу на фронце соцыялістычнага будаўніцтва, будаўніцтва новых дзесяткаў і сотняў гігантаў соцыялістычнай індустрыі.

Усё гэта ставіць пытаньне аб максымальнай мобілізацыі ўнутраных мэталічных рэсурсаў краіны, прымушае яшчэ раз паставіць пытаньне аб ліквідацыі ўсіх мэталічных лішкаў, бо асновай індустрыі зьяўляецца мэталь.

Ужо некалькі раз праводзіліся зборы мэталялому. З усіх куткоў выцягваліся закінутыя часткі машын, дзесяткі тон мэталю, але ня ўсё яшчэ мобілізавана, яшчэ шмат чаго не скарыстоўваецца.

Абвешчаная ЦСПСБ і ЦК ЛКСМБ дэкада па збору мэталялому прымушае ўсе профсаюзныя і комсамольскія організацыі пакласьці ўсе сілы на канчатковую ліквідацыю мэталюргічных рэзэрваў, каб забясьпечыць заводы мэталем для далейшага нормальнага росту краіны.

Комсамольскія організацыі на мясцох павінны стварыць опэрацыйныя групы, якія будуць высьвятляць завалі і організоўваць масавыя суботнікі з удзелам піонэраў і школьнікаў для гэтай працы.

Групы „лёгкай кавалерыі" павінны быць кінуты на гэты фронт з тым, каб прыцягнуць да адказнасьці тых гаспадарнікаў, якія хаваюць мэталь, перашкаджаючы праводзіць збор.

Дэкада збору мэталялому павінна быць цесна ўвязана з усёй працай комсамолу ў галіне мобілізацыі ўнутраных рэсурсаў і барацьбы за прамфінплян з тым, каб усе магчымасьці, усе захаваныя запасы былі знойдзены і кінуты на справу нашага соцыялістычнага будаўніцтва.

200 КОМСАМОЛЬЦАЎ-НА АШЧАДНУЮ СПРАВУ

ЦК ЛКСМБ абвясьціў мобілізацыю 200 комсамольцаў на працу ў ашчадкасы

Разгортваючы соц. спаборніцтва, практыку шэфства комсамольскіх організацый над ашчадкасамі, забясьпечым выкананьне і перавыкананьне фінплянаў

Ніводнага комсамольца без ашчадкніжкі!

Ліквідаваць прарывы ў ашчадсправе

Каб выканаць заданьне асобага кварталу, якое для ашчадкас БССР складае 3350 тыс. руб., патрэбны самыя шпаркія тэмпы ў рабоце як самога ашчаднага апарату, так і ўсёй грамадзкасьці.

Ход працы паказаў, што мы за **першую палову асобага кварталу маем недапушчальна слабыя вынікі.** Так, кастрычнік месяц, які павінен быў даць 1230 тыс. руб. фізычных ўкладаў, даў адліў па БССР у суме 360 тыс. р. Адліў у кастрычніку адбыўся па гарадзкім сэктары, а таксама і ў паасобных раёнах.

За 1 дэкаду лістапада па БССР маецца адліў у суме 87,5 тыс. р., прычым па горадзе адліў складае 123,9 т. р. З раёнаў-жа ўсяго паступіла 36,4 т. р.

Вынікі 2-й дэкады лістапада характарызуюцца ўжо некаторым зрухам, які, аднак, зьяўляецца недастатковым і не зьмяняе становішча. Усяго па сыстэме ашчадкас за 2-ю дэкаду паступіла 411,9 т. р., (па горадзе—239,2 т. руб., а на вёсцы —172,7).

Такім чынам за кастрычнік і 2 дэкады лістапада, замест прыліву, **маецца адліў укладаў у суме 25,6 т. р.**

Ашчадкасы ня ўсюды давялі кантрольныя заданьні да кожнага прадпрыемства і ўстановы паасобку, а то дык—формальна, без належнага абгаварэньня на агульных сходах рабочых, у грамадзкіх організацыях і г. д.

Зразумела, што прычынай прарыву ў галіне ашчадсправы зьяўляецца ня толькі слабая праца ашчадапарату. Вельмі адмоўна ўплывае на работу ашчадкас недастатковая ўвага і дапамога ў гэтай справе з боку грамадзкасьці.

Профсаюзныя організацыі ў большасьці раёнаў да гэтага часу вельмі мала займаюцца справай мобілізацыі сродкаў, ня ўдзельнічаюць у растлумачальнай рабоце па ашчадсправе і інш. пытаньнях. У прыватнасьці, важнейшае мерапрыемства для ўмацненьня нашай фінансавай і грашовай сыстэмы—безнаяўныя разьлікі па масавых плацяжох насельніцтва да гэтага часу разьвіта яшчэ вельмі слаба. У шэрагу гарадоў безнаяўныя разьлікі амаль ня ўжываюцца (Ворша, Полацак, Бабруйск), у буйных гарадох (Менск, Віцебск, Гомель) безнаяўныя разьлікі ўжываюцца ў вельмі нязначнай меры і ахапляюць нязначную колькасьць працоўнага насельніцтва.

На вёсцы мы маем слабасьць ашчаднага апарату і недаацэнку з боку паасобных РВК важнасьці гэтай справы. Ня гледзячы на самыя катэгорычныя пастановы ўраду, у 23 раёнах райкасы яшчэ не організаваны з прычыны адсутнасьці памяшканьня.

Соцыялістычны сэктар вёскі, які павінен стаць апорным пунктам для работы сярод асноўнай масы сялянства, да гэтага часу мае толькі 50 ашчадкас. Камісіі садзейнічаньня ў большасьці колгасаў не організаваны.

Нездавальняюча выконваюцца заданьні па падпісцы на пазыку „Пяцігодка—у 4 гады"; шэраг ашчадкас вызначанай кантрольнай лічбы па рэалізацыі пазыкі сярод сялянства ня выканаў. У гарадзкім сэктары наглядаецца значны разрыў між аформленай колектыўнай падпіскай і паступленьнем чарговых узносаў.

Замест 1013 т. р. паступіла да гэтага часу чарговых узносаў усяго 396 тысяч. Асноўнай прычынай гэтага зьяўляецца нядбальства ашчадкас і недастатковая настойлівасьць іх.

У шэрагу раёнаў, дзе з дапамогаю грамадзкасьці праводзяцца агітацыйна-падворныя абходы, вынікі па ўцягненьню сялян у ашчадкасы досыць вялікія. Так, у Слуцкім раёне, мобілізаваныя партыйнымі і профсаюзнымі органамі брыгады, пры падворным абходзе дасягнулі значных посьпехаў у сэнсе вярбоўкі ўкладаў і ўкладчыкаў. Тое самае трэба сказаць і аб Камарынскім і Сеніэнскім раёнах.

Абвешчаны ЦК КП(б)Б 10-ці дзёньнік мобілізацыі сродкаў павінен даць рашучы зрух у працы і забясьпечыць ліквідацыю маючыхся прарываў.

Недбальству, надзеям на самацёк трэба пакласьці канец.

Мясцовыя кіруючыя органы павінны нарэшце пераламіць у сваіх умовах дырэктывы партыі і ўраду па гэтаму пытаньню.

Палеес.

Камсады Менску працуюць нездавальняюча

Па пачыну Фрунзэўскага Раён. НК РСІ 15-XI былі створаны брыгады „Л. К." для абсьледваньня працы камсадаў па мобілізацыі сродкаў, шляхам рэалізацыі пазыкі „Пяцігодка—ў чатыры гады" і ўцягненьня ўкладаў у ашчадкасы.

„Л.К." былі абсьледваны 33 камсады, у выніку чаго выявіўся шэраг момантаў, якія адмоўна адбіваюцца на выкананьні тых адказьнейшых задач, якія пастаўлены партыяй і ўрадам перад нашай грамадзкасьцю ў справе мобілізацыі вольных і часова вольных сродкаў працоўнага насельніцтва на соцбудаўніцтва.

Налёт выявіў наступнае:

Амаль ва ўсіх абсьледаваных колектывах адсутнічае 100 проц. ахоп усіх рабочых і служачых падпіскай на пазыку (83 проц. у адносінах да агульнай колькасьці рабочых і служачых).

Па будаўнічых організацыях справа мобілізацыі сродкаў стаіць асабліва дрэнна. Падпіскай на пазыку ахоплена толькі 56 проц. працоўных, г. зн., што 44 проц. рабочых будаўнікоў не падпісаліся на пазыку. Таксама дрэнна стаіць справа з уцягненьнем рабочых-будаўнікоў укладчыкамі ашчадкасы.

Падпіска на пазыку ў абсьледаваных колектывах складае толькі 94-95 проц. у адносінах да фонду 2-х тыднёвага заробку.

Адсутнасьць усялякага кіраўніцтва камсадамі з боку парт. і проф. організацый на мясцох, а таксама з боку крэдытных устаноў.

Адсутнасьць сталай агіт-растлумачальнай працы па пытаньнях дзяржпазык і ашкадкас, у выніку чаго меліся выпадкі адмовы ад падпіскі на пазыку (з-д „Комунар").

Пытаньнем безнаяўных разьлікаў—аднаго з сродкаў узмацненьня нашае грашовае сыстэмы—ня цікавяцца ні камсады, ні парт. і профорганізацыі, у выніку чаго проц. карыстаньня імі ледзь дасягнуў 10 проц.

Соцспаборніцтва паміж колектывамі рабочых і служачых на лепшае правядзеньне кампаніі мобілізацыі сродкаў зусім ня ўжываецца; насьценгазэты пытаньняў дзяржкрэдыту і ашчадсправы не асьвятляюць.

Раённым камітэтам партыі, комсамолу і ЦСПСБ неабходна тэрмінова ўзяцца за ажыўленьне працы камсадаў на мясцох, за сапраўднае кіраваньне працай на мобілізацыі сродкаў парт., комсамольскімі і профорганізацыямі, стварыўшы вакол камсадаў сталы актыў з лепшых ударнікаў і комсамольцаў.

Г. Клейн.

Брыгада ЦК ЛКСМБ па праверцы мобілізацыі фінсродкаў

Забясьпечым баявы … ўдзел піонэрорганіза… ў мобілізацыі срод…

З лісту да ЦБ ДКА БС…

У сучасны момант перад пар… і сав. уладай стаіць вялізарная … дача па мобілізацыі сродкаў пр… нага насельніцтва на забеспячэ… выкананьня фінпляну пяцігодкі…

Зьвяртаючыся к ЦБ ДКА Б… штаб просіць прыцягнуць ус… онэр-атрады да правядзеньня … рокай растлумачальнай кампа… безнаяўных разьліках.

Удзел піонэр-організацыі … лым і кожнага піонэра паасоб… данай працы, па думцы ш… мысліцца наступным чынам:

на ўсіх зборах атрадаў пра… гутаркі аб сутнасьці безна… разьлікаў;

на зьвеньневых занятках … весьці гутаркі аб тэхніцы бе… ных разьлікаў (запаўненьне … загадаў);

кожны піонэр паасобку дом… вінен весьці растлумачальную … сярод бацькоў (шляхам рас… чэньня мэты і значэньня бе… ных разьлікаў, а таксама і т… нае выкананьне гэтых жы… гадаў);

піонэр-атрады павінны аб… паасобныя жакты з мэтай да… чы жактаўскаму актыву ў р… мачэньні мэты і сутнасьці бе… ных разьлікаў, а таксама … іх выкананьня;

піонэр-атрады павінны ўдз… чаць у распаўсюджваньні лі… па безнаяўных разьліках на … заводах і інш. прадпрыемст… ўстановах;

піонэр-атрады павінны ўст… у соц. спаборніцтва паміж асо… атрадамі і зьвеньнямі на … правядзеньне растлумачальнай …

Усе праводзімыя мерапрые… і вопыт сваёй працы піонэр-а… павінны асьвятляць у сваім … скім і комсамольскім друку.

Штаб па мобілізацыі сродк… дзяецца, што піонэр-організа… гэтай рабоце забясьпечаць … ўдзел.

Штаб па мобілізацыі с… каў пры кіраўні… ашчадкас гор. Ме…

М. Югаў

Вялікадзяржаўная контрабанда пад сьцягам беларускага нацыяналізму*)

Адзін з беларускіх нацыяналістычных „дзеячоў", Цьвікевіч А., былы міністар (і нават прэм'ер) контр-рэволюцыйных буржуазна-нацыяналістычных урадаў напісаў і пры садзей асьці ранейшага нацыянал опортуністычнага кіраўніцтва Беллзяржвыдавецтва надрукаваў кнігу „Западно-руссизм".

Гэта кніга зьяўляецца настолькі да сканалай па самавыкрыцьці беларускага нацыяналізму, што, калі-б не прынцыповая немагчымасьць для савецкіх органаў распаўсюджваць, ды яшчэ пад маркай Дзяржвыдавецтва, чорнасоценную літаратуру, яе варта было-б выпусьціць на кніжны рынак.

Кніга гэта ўжо пасьля надрукаваньня была конфіскавана. Тым ня менш кніга патрабуе разгляду, хаця-б ужо таму, што часткова, у выглядзе паасобных артыкулаў, друкаваных у „Полымі" у форме акадэмічнага абмеркаваньня асобных разьдзелаў у інстытуце гісторыі Беларускай Акадэміі Навук, зьмест і ідэі гэтай кнігі прасякнулі ў пэўныя колы.

У чым-жа сэнс гэтай кнігі „Западно-руссизм"? Коратка кажучы, у спробе ўстанавіць пераемнасьць і адзінства ў разьвіцьці беларускай нацыянальнай ідэі, пачынаючы ад мацёрых расійскіх прыгоньнікаў, іх агентаў, і канчаючы сёньнешнім днём.

Рэакцыйнасьць гэтае спробы, амаль што адзінай у сваім родзе ў буржуазна-нацыяналістычнай літаратуры ўсіх народ ў СССР, тлумачыцца поўнасьцю абвостранай клясава-варожай позыцыяй аўтара, хаця трэба ўказаць яшчэ, што аўтар гэтае вялізарнае (у 340 старонак) працы выключны невук. Падрабязны разгляд гэтай кнігі мы зробім у „Бальшавіку Беларусі", тут-жа мы хочам у некалькіх словах азнаёміць чытача „Зьвязды" з гэтай надзвычайнай кнігай.

Як вядома, беларускі **нацыянальны** рух праявіўся, у сувязі з агульнымі гістарычнымі ўмовамі разьціцьця народу даволі позна. Але і ў самых раньніх сваіх праяўленьнях, як і пазьней, у пачатку XX стагодзьдзя, ён ніколі ня быў зьвязан з прыгоньніцкімі тэорыямі і партыямі. Ян Чачот, Дунін-Марцынкевіч, Кастусь Каліноўскі, Францішак Багушэвіч знаходзіліся пад уплывам польскага радыкальна-опозыцыйнага руху. Гэты рух, нават у сваім правым буйна-буржуазным крыле, ня гледзячы на клясава-абмежаваны характар, зьяўляўся ў агульным і цэлым рухам прогрэсыўным, у сваёй дробна-буржуазнай часьці гэты рух зьяўляўся бязумоўна рэволюцыйным. Маркс, выходзячы з палажэньня, цалкам акрэсьліваўшага для яго адносіны да ўсіх эўропэйскіх спраў, іменна з таго, што расійскі царызм зьяўляўся галоўным ворагам усяго вызваленчага і рэволюцыйнага руху ў Эўропе, надзвычай станоўча адносіўся да польскага руху, у прыватнасьці да польскага паўстаньня 1863 году, увесь час падкрэсьліваючы ўсю палавіннасьць, невыстарчальнасьць рашэньняў, нават левых, рэзка крытыкуючых буржуазную лінію паводзін. Як вядома, гэтыя погляды Маркса цалкам падзяляліся і Леніным: „Тады, —пісаў Ленін—рэволюцыйнаю была іменна Польшча ў цэлым, не толькі сялянства але і маса дваранства. Тады поўная перамога дэмократыі ў Эўропе была сапраўды немагчыма без аднаўленьня Польшчы. Тады Польшча была сапраўды аплотам цывілізацыі супроць царызму, перадавым атрадам дэмократыі".

Другая лінія сувязі беларускага нацыянальнага руху штурхала яе прадстаўнікоў да расійскага вызваленчага руху. Той-жа Кастусь Каліноўскі меў адносіны да пецярбурскіх рэволюцыйных гурткоў, праўда, далёка ня самых крайніх і пасьлядоўна-рэволюцыйных, у 80 гадох выходзіць „Гомон", які праводзіў у масы ідэі „Народной Воли", у пачатку XX стагодзьдзя беларускія дробна-буржуазныя рэволюцыйныя групы ўскладаюць усе свае надзеі на расійскі вызваленчы рух. Мы ня лічым патрэбным тут указваць на невыстарчальную рэволюцыйнасьць практыкі і тэорыі ўсіх гэтых асоб, груп, рухаў, падкрэсьліваць наяўнасьць буржуазных, нацыяналістычных элемэнтаў у іх програме і дзейнасьці. Мы зараз ня будзем спыняцца і на тым, гісторыяй ужо вырашаным, пытаньні, што толькі пролетарская рэволюцыя аказалася ў стане даць міліённым масам раней прыгнечаных расійскім царызмам нацыянальнасьцяй сапраўднае нацыянальнае вызваленьне, поўнасьцю вызваліць ад колёніяльнай залежнасьці. Мы хочам толькі ўказаць, што беларускі нацыянальна-вызваленчы рух *), заўсёды ўскладаў свае надзеі на польскі ці расійскі рэволюцыйна-вызваленчы рух.

Гэта і зразумела. Калі паўднёва-славянскія народы, якія стагналі пад ярмом турэцкага фэодалізму, і маглі ўскладаць нейкія цьмяныя на… расійскую імпэрыю (Маркс як… ма, лічыў гэтыя рухі, паколькі… орыентуюцца на расійскі царызм… акцыйнымі), дык беларускія на… масы, якія на сабе адчувалі ўсю… гожасьць прыгоньніцкай апы… му, у сваім сьвядомым руху … цыянальнага вызваленьня усе… надзеі маглі ўскладаць толькі на… царызму. Буйнае расійскае… ляўладаньне, як і буйнае… скае зямляўладаньне, адно… імкнуліся азбавіць белар… селяніна права на беларуску… ву, беларускую гісторыю, адно… імкнуліся абярнуць яго ў „бы… жывы інвэнтар польскага (і бе… скага полёнізаванага) або ра… (і беларуска-русыфікаванага) бу… памешчыцкага маёнтку. Але на… ране буйнога расійскага зямляўл… ня знаходзіўся магутны дзяр… апарат, які пагражаў цэлай сы… рэпрэсій нацыянальнаму існав… ня толькі беларускага, але і не… на больш моцнага культурна, … мічна і політычна, польскага на… Вось чаму стварылася на перш… сох—у барацьбе з русыфікатар… політыкай прыгоньніцкага цары… больш цесная сувязь паміж пра… нікамі опозыцыйнага беларускага… хецтва і шляхецкай інтэлігенцыі… польскімі опозыцыйнымі коламі… вымушан прызнаць і Цьвікевіч…

(Працяг будзе).

---

*) Артыкул друкаваўся ў № 279 „Зьвязды" ад 30 лістапада 1930 г.

*) У адрозьненьне ад буржуазнага нацыянал-адраджэнчага руху, які ставіў стаўку з ўсёды на зьдзелку з царызмам і саюз ліберальна-контррэволюцыйнай буржуазнай Расіі.

ЛЕПШЫ РАПАРТ ЗЬЕЗДУ—
ПЕРАВЫКАНАНЫ ПРАМФІНПЛЯН



100 проц. соцыялістычнай контрактацыяй комсамольскімі заставамі браку опэрацыйна-плянавымі групамі створым баявы рапарт бальшавіцкіх перамог

Зьнішчайце бюрократычныя рагаткі на шляху разгортваньня комсамольскай ініцыятывы

ВАШ УДЗЕЛ У ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА Х ЗЬЕЗДУ ЛКСМБ?

Да ўсіх гаспадарчых, профэсыйных, савецкіх і грамадзкіх організацый

15-XII 30 г. адчыняецца Х усебеларускі зьезд комсамолу. Зьезд павінен будзе падагуліць двухгадовую сваю дзейнасьць і азначыць месца беларускага комсамолу ў выкананьні 5-цігодкі ў 4 гады і рашаючага 3 году. На зьезьдзе, апрача справаздачы ЦК ЛКСМБ і ЦК УсеЛКСМ, будуць абгаварвацца таксама і такія пытаньні, як колектывізацыя і комсамол, комсамол на вытворчасьці, нацкультбудаўніцтва і выхаваньне дзяцей.

На зьезд зьбяруцца дэлегаты з усіх куткоў Беларусі. Наш абавязак ня толькі гаварыць аб нашых посьпехах і недахопах, але і паказаць нашы лепшыя дасягненьні ва ўсіх галінах соцбудаўніцтва, паказаць рост гаспадаркі і культуры нашай рэспублікі. ЦК комсамолу лічыць, што ўдзел усіх грамадзкіх організацый у падрыхтоўцы да зьезду і яго работах значна палегчыць выкананьне тых задач, якія стаяць перад зьездам. Таму мы зварочваемся да вас прыняць актыўнейшы ўдзел ў падрыхтоўцы і правядзеньні зьезду ЛКСМБ, як у галіне прапрацоўкі ўсіх пытаньняў, якія будуць стаяць на зьезьдзе, абгаварэньні іх праз друк, таксама і ў галіне абслугоўваньня дэлегатаў.

Чаго мы жадаем?

Мы жадаем, каб вы ўнесьлі свае прапановы да зьезду комсамолу.

Мы жадаем, каб былі праведзены экскурсіі дэлегатаў зьезду на прадпрыемствы Менску і організаваны вечары сустрэчы Менскага пролетарыяту і дэлегатаў.

Мы жадаем, каб дэлегаты пачулі лепшыя творы музыкі, сьпевы, каб дэлегаты пабачылі лепшыя рэчы кіно і тэатру.

Мы жадаем, каб Дзяржвыдавецтва паклапацілася б прасунуць лепшую кнігу ў масы моладзі.

Мы жадаем, каб ЦРК праявіў максымум чуласьці, увагі, дысьціпнасьці і паказаў-бы прыклад організацыі грамадзкага харчаваньня.

Ступень і формы ўдзелу ў зьезьдзе мы прадстаўляем ініцыятыве х організацый.

Мы ўпэўнены ў тым, што вы прымеце жывейшы ўдзел у нашым зьезьдзе і не зацягнеце з адказам на нашу адозву.

Сэкратар ЦК ЛКСМБ—ПАЛЯКОЎ.

Старшыня камісіі па скліканьню Х зьезду ЛКСМБ—РЫНДЗІЧ

ДУШАЦЬ ТВОРЧУЮ ІНІЦЫЯТЫВУ

— „... Мы, комсамольцы плянава-статыстычнага аддзеленьня факультэту народнае гаспадаркі БДУ, надаючы вялізарнае палітычнае і экономічнае значэньне ўнутры-заводзкаму плянаваньню, ухвалілі прыняць шэфства над плянава-опэрацыйнымі брыгадамі нашых сатаварыскіх заводаў „Бальшэвік“ і „Полымя Рэволюцыі“, выстаўляючы ў асноўным задачы—організоўваць на гэтых прадпрыемствах плянава-опэрацыйныя групы, systэматычна кіраваць імі, мобілізоўваць усю рабочую грамадзкасьць навакол задач унутры-заводзкага плянаваньня“.

Гэты заклік комсамольцаў-плянавікоў, падхоплены „Чырвонай Зьменай“, зьяўляўся падарункам комсамольскім зьездам. Плянаўкі, доўга ня думаючы зараз-жа ўзяліся за выкананьне ўзятых на сябе абавязкаў. Па ініцыятыве комсамольскай ячэйкі склікаецца агульны сход студэнцтва плянавага аддзяленьня. Тут-жа, на аснове добраахвотнасьці, утвараюцца ўдарныя брыгады, выбіраюцца кіраўнікі. Беспартыйнае студэнцтва праяўляе надзвычайна вялікую актыўнасьць да гэтай справы.

— Гэтая прапанова комсамольскай ячэйкі робіць вялікі крок да сапраўднай сувязі паміж студэнцтвам і вытворчасьцю. Яна дасьць магчымасьць кожнаму студэнту адбываць бесьперапынную вытворчую практыку, непасрэдна зьвязваючы яе з тэорэтычнымі заняткамі, а, галоўнае,—узварухне зародкі плянава-опэрацыйных брыгад.

Так адзін за адным заяўлялі выступаўшыя студэнты. Частка навуковых працаўнікоў узялася консультаваць занятых на вытворчасьці студэнтаў.

Хлопцы пераключылі ўвесь свой пал, усю энэргію непасрэдна на вытворчасьць, у прыватнасьці на заводы „Бальшавік“ і „Полымя Рэволюцыі“. Рабочая грамадзкасьць гэтых заводаў падтрымала гэтую прапанову і пашла насустрач. На комсамольскім сходзе заводу „Полымя Рэволюцыі“ зараджаюцца першыя плянава-опэрацыйныя брыгады.

Опортуністычная „тэорыя“ аб „экспэрымэнцікаx“

Здаецца, усё добра... Патрабуецца толькі систэматычнае кіраўніцтва і дапамога ў гэтай справе з боку бюро комсамольскага колектыву Наргасу БДУ для таго, каб у хуткім часе можна было-б зрабіць гэты рух набыткам кожнага заводу, перанесьці станоўчы вопыт на ўсе фабрыкі і заводы Савецкай Беларусі.

Але, ня тут-та было... Політычна-блізарукія „ідэолёгі“ з бюро комсамольскага колектыву Наргасу БДУ недаацанілі політычнай важнасьці і значэньня гэтай работы.

Ячэйка ЛКСМБ плянава-статыстычнага аддзяленьня выставіла некалькі патрабаваньняў на бюро комсамольскага колектыву. Яна патрабавала вылучыць неабходныя кадры людзей на гэту справу, як найхутчэй мобілізаваць сілы ў прамысловым аддзяленьні, а ад колектыву — сыстэматычнага кіраўніцтва.

Але, якраз тут уся ініцыятыва, уся энэргія плянавікоў упёрлася ў сьцяну опортуністычнае дабрадушнасьці.

— Бачыце, плянава - статыстычнае аддзяленьне ўзяло „сусьветны маштаб“ (?) (організаваць плянава-опэрацыйныя групы на двух заводах). Трэба раней зрабіць „экспэрымэнцік“ над аднэй брыгадай, каб высьвятліць ці магчыма наогул правядзеньне такога руху“ (?)—заяўляе на бюро комсамольск. колектыву член бюро т. Палк, які, паміж іншым, зьяўляецца кіраўніком пазавузаўскага сэктару, непасрэдным „правадніком“ гэтай справы. Трэба зрабіць „экспэрымэнцік“,—„як-бы чаго ня вышла“. Тав. Палк пачынае „экспэрымэнцікі“ у той час, калі найлепшымі „экспэрымэнцікамі“ зьяўляюцца плянава-опэрацыйныя брыгады на Пуцілаўскім і іншых заводах Ленінграду. Сустрэчны плян опэрацыйных брыгад, рацыяналізатарскія групы даволі хлёстка б'юць па прароцтвах правых, якія ня вераць у творчую ініцыятыву пролетарыяту.

Супроць фактаў не папрэш!

Заўтра-ж спынеце работу!

Цікава і тое, што бюро комсамольскага колектыву не па-бальшавіцку ацаніло гэтае выступленьне, не дало належнага адпору. Наадварот—яно пашла яшчэ „глыбей“. Яно пастанавіла:

1. Адхіліць просьбу плянава-статыстычнага аддзяленьня аб вылучэньні сталага кадру людзей для кіраўніцтва плянава-опэрацыйнымі групамі.

2. Склікаць 27-га нараду з прадстаўнікоў дзяржпляну і студэнцтва для абгаварэньня гэтага пытаньня (паміж іншым нарада яшчэ дагэтуль ня склікана).

3. Скліканьне нарады і кіраўніцтва гэтай работай ускладаецца на Палка, як кіраўніка па-за вузаўскай работай.

Рашэньне відочна. Да чаго-ж зьвяло ўсю гэтую справу бюро комсамольскага колектыву?— Да сухой, пустазвоннай балбатні, да зрыву ўсёй пачатай работы ў гэтым напрамку і, нарэшце, яно дало магчымасьць опортуністаму Палку праводзіць сваю тэорыю на практыцы.

Сэкратар комсамольскага колектыву —т. Вайнэр расчысьціў твань, якою фактычна прыкрывалася гэта пастанова, адкрыта заявіўшы сэкратару плянстатаўскай ячэйкі:

— Хіба ты не зразумеў нашай пастановы? Заўтра-ж спынеце работу, бо ніхто ня ведае як праводзіць яе.

Тав. Вайнэр, хто-ж тады ведае, калі ня вы—бяз некалькіх месяцаў плянавікі, якія як тэорэтычна так і практычна досыць падрыхтаваны ў гэтым напрамку? Але, што агітаваць. Гэта нават сьляпому відочна.

Біць па заціскачох творчай ініцыятывы

Як пастанова, так і чыннасьць досыць яскрава выявілі твар бюро комсамольскага колектыву. Гэты „гора—кіраўнікі“ імкнуцца зьвесьці ўсю сувязь з вытворчасьцю да голага культурніцтва, да пустой „схолястыкі“ заціскаючую жывую творчую ініцыятыву студэнцтва.

Напярэдадні комсамольскіх зьездаў мы ў асаблівасьці павінны ўскалыхнуць усю творчую ініцыятыву ленінскага комсамолу і працоўнай моладзі. Трэба набіць багатую скарбонку комсамольскага вопыту для вызначэньня далейшых задач усяго комсамолу. Трэба моцна біць па руках усялякіх заціскачоў творчай ініцыятывы.

Сёмка.

100 проц. контрактацыя комсамольцаў да зьездаў

Рэалізуем прапановы комсамолкі Цвэй

Комсамолка віцебскай акулярнай фабрыкі Роза Цвэй выступіла на старонках газэты „Чырвоная Зьмена“ з шэрагам конкрэтных прапаноў па палепшаньню саюзнай працы ў парадку падрыхтоўкі да Х-га зьезду ЛКСМБ і ІХ-га зьезду УсеЛКСМ.

Сярод многіх прапаноў, тав. Цвэй прапануе да Х-га зьезду ЛКСМБ і ІХ-га зьезду ЎсеЛКСМ закончыць замацаваньне комсамольцаў за вытворчасьцю да канца пяцігодкі. Гэтая прапанова на сёньнешні дзень мае асабліва важнае значэньне. Мы знаходзімся на парозе трэцяга, рашаючага году пяцігодкі. Перад намі яшчэ шмат боек на фронце соцыялістычнага будаўніцтва. Аднак, шмат комсамольцаў мы яшчэ заўважваем у чорных сьпісах „лятуноў“, ёсьць яшчэ багата комсамольцаў, якія не закантрактаваліся за прадпрыемствамі. Гэта дае свае адмоўныя вынікі. Даволі адзначыць, што толькі за апошнія дні 10 чалавек комсамольцаў пакінула Менскі Будвуч пры Белдзяржбудаб'яднаньні. Такія прыклады, на вялікі жаль, не адзінкавы.

Прапанова тав. Цвэй павінна быць рэалізавана. Абвяшчаючы рашучую вайну „лятуном“, неабходна дабіцца на бліжэйшы час 100 проц. контрактацыі комсамольцаў за вытворчасьцю.

Як конкрэтную прапанову можна прыняць і неабходна рэалізаваць думку аб стварэньні застаў браку. Брак на вытворчасьці—адна з галоўнейшых перашкод у выкананьні прамфінпляну. Комсамольскія заставы браку ў процэсе вытворчасьці не павінны прапускаць у далейшы вытворчы процэс брак, чым ён будзе значна зьніжан і нават зусім зьнішчан.

Наша вытворчасьць расьце. Побач з ёю расьце патрэбнасьць у рабочай сіле. Амаль увесь час у рабочы колектыў уліваюцца новыя кадры за лік вёскі і падрастаючага пакаленьня пролетарыяту — фабзавучнікаў. Прапанова тав. Цвэй у адносінах шэфства комсамольцаў над новымі рабочымі набывае асаблівае значэньне. Навучыць новага рабочага любіць завод і варштат, выбіць часам рвацкія настроі, якія правікаюць з кулацкай часткі вёскі, уцягнуць у соцыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва—важнейшая задача комсамолу, пры ажыцьцяўленьні якое магчыма пасьпяховае выкананьне прамфінпляну.

Акрамя гэтых прапаноў тав. Цвэй уносіць яшчэ шэраг іншых, шмат якія з іх ня маюць асаблівай каштоўнасьці.

Некаторыя прапановы ня зусім адпавядаюць нашым запатрабаваньням. Тав. Цвэй прапануе праводзіць **цэхавыя комсамольскія** вытворчыя нарады, таксама яна прапануе організоўваць пры ячэйках гурткі вынаходцаў і рацыяналізатараў.

Комсамольская ячэйка не павінна адмяжоўвацца ад усяго рабочага колектыву тэй ці іншай фабрыкі не ствараць асобныя гурткі вынаходцаў, праводзіць асобныя комсамольскія вытворчыя нарады, і г. д.

Г.

„Чырвоную Зьмену“—у масы

40.000 ПАВІННА БЫЦЬ—40.000 БУДЗЕ!

Комсамольскія колектывы рапартуюць да Х зьезду ЛКСМБ: СОЦЫЯЛІСТЫЧНЫ ДАГАВОР БУДЗЕ ВЫКАНАН

Выконваем соцдагавор

Комсамольскі к-тыў ф-кі „Чырвоны Тэкстыльшчык“ налічвае 80 чал., акрамя 40 чал. беспартыйнай рабочай моладзі. Да гэтага часу на ўвесь к-тыў выпісвалася менш 40 экз. „Чырвонай Зьмены“.

З мэтай поўнага ахопу комсамольцаў і рабочай моладзі падпіскай на газэту, у час пяцідзёнкі паміж цэхавымі ячэйкамі праводзіцца конкурс на лепшае распаўсюджваньне і разгортваньне масавай працы вакол „Чырвонай Зьмены“. Праведзены вечары газэт, якія ўжо далі станоўчыя вынікі. Організаваны юнкораўскія брыгады, якія пачалі працаваць. Шырока разгорнута падпіска сярод рабочае моладзі.

Разгортваючы спаборніцтва, к-тыў „Чырвоны Тэкстыльшчык“ выконвае соцдагавор, ахапіўшы падпіскай на „Чырвоную Зьмену“ комсамольцаў і моладзь да зьезду ЛКСМБ.

Юнкор. Брыгада.

Абвясьцілі сябе ўдарнікамі

Вучні Ельскай ШКМ абвясьцілі сябе ўдарнікамі па распаўсюджваньню „Чырвонай Зьмены“ і выклікаюць на спаборніцтва Санюкоўскую ШКМ.

Сабчанка Я.

Пяцідзёнка—на ўдарных тэмпах

Папярэднія вынікі ўдарнай пяцідзёнкі па зав. „Полымя Рэволюцыі“ даюць наступны малюнак:—з 230 чалавек рабочай моладзі падпісалася на газ. „Чырвоная Зьмена“—210 чалавек. Комсамольская ячэйка заводу складаецца з 60 чал. Падпісная работа на газэту праводзілася ўдарнымі брыгадамі.

Піонэры не адстаюць ад комсамольцаў, распаўсюджаны дзіцячыя выданьні. Гэтымі днямі піонэрскі атрад робіць вылазку на завод да бацькоў, каб апошнія выпісалі ім газэты.

Цывэо.

„Агітуе кулаком“

На сьнежань сярод студэнтаў Марына-Горскага тэхнікуму распаўсюджана 150 экз. „Чырвонай Зьмены“. Падпіска на газэту была-б яшчэ большай, каб паасобныя таварышы не перашкаджалі ў гэтым. Так, курсант падрыхтоўчых курсаў Ліпніцкі за выпіску газэт „агітуе кулаком“, чым адштурхоўвае студэнтаў ад падпіскі. Профком тэхнікуму аб гэтым ведае, але захадаў да спыненьня „кулачнай агітацыі“ ня прымае.

Алесь Зоркі.

Наш абавязак

Юравіцкая местачковая ячэйка ЛКСМБ шырока разгарнула працу па распаўсюджваньню „Чырвонай Зьмены“. На газэту падпісаліся ўсе комсамольцы, з іх—20 гадавых падпісчыкаў.

Ячэйка ўзяла на сябе абавязак распаўсюдзіць па раёне 120 экз. „Чырвонай Зьмены“.

Гарбар С.

„...У нас ёсьць спэцыяльныя ўпаўнаважаныя“

На швэйнай ф-цы „Кастрычнік“ справа ўдарнай пяцідзёнкі па прасоўваньню юнацкага друку фактычна сарвана. Тут ня лічаць неабходным вылучаць брыгады па праверцы становішча распаўсюджваньня друку.

— У нас на фабрыцы і так шмат брыгад працуюць,—гаворыць загадчык экономсэктару к-ву тав. Казлоў, а таму к-тыў зусім не займаўся пытаньнем „пяцідзёнкі“.

У нас спэцыяльныя ўпаўнаважаныя, якія ведаюць справай распаўсюджваньня.. так, што яны і працуюць... Але ўпаўнаважанымі ня кіруюць.

Ц.

Справа „Прамысловай партыі“

Імпэрыялістычным катам не мінаваць адказнасьці перад судом працоўных мас

Бандыт Пуанкарэ—арганізатар інтэрвэнцыі

Паказаньні падсуднага Чарноўскага

Самавіты шкоднік профэсар Чарноўскі (яму зараз 62 гады) мае дыплёмы двух вышэйшых навучальных установ—Маскоўскага унівэрсытэту і НТС. Польскае паходжаньне яму доўга перашкаджала атрымаць катэдру ў царскай Расіі. Тым ня менш да самадзяржаўя, як устанаўляе на судзе сам падсудны, ён адносіўся толькі абыякава: самадзяржаўе яму не перашкаджала. Затое ўжо лютаўская рэволюцыя напоўніла яго сэрца трывогай, смутным чаканьнем нейкіх перамен. Кастрычніцкую рэволюцыю Чарноўскі сустрэў „з пачуцьцём нязычлівасьці“, а па сутнасьці надта варожа.

Пачатак сваёй шкодніцкай дзейнасьці Чарноўскі адносіць да вясны 1927 г. У гэты час ён пачаў працаваць у навукова-тэхнічным савеце па мэталяпрамысловасьці. Старшыняваў у НТС шкоднік Хрэньнікаў, з якім Чарноўскі быў зьвязаны па сваёй контррэволюцыйнай сумеснай працы на заводзе. Сустрэча з Хрэньнікавым нібыта і вырашыла лёс Чарноўскага: ён стаў членам шкодніцкай організацыі. Чарноўскі цьвёрда настойвае на тым, што шкодзічаць ён пачаў толькі з вясны 1927 г. Усе тыя „дзіўныя“ зьявы, акія адбываліся на яго вачох, як-то: ліквідацыя некаторых заводаў, консэрвацыя іншых заводаў, няправільнае выкарыстаньне і пагібель абсталяваньня і г. д. і г. д. профэсар-тэорэтык і інжынэр-практык Чарноўскі тлумачыў, „выбачайце за выраз, галавацяпствам.

Аб падрыхтоўцы інтэрвэнцыі Чарноўскі ўпяршыню даведаўся ад Хрэньнікава ў купэ вагона, дзе ён у цесным коле расказаў аб сваім парыскім спатканьні.

— Я,—апавядае падсудны,—паставіў пытаньне: як мяркуецца інтэрвэнцыя пры адсутнасьці падтрыманьня мясцовага насельніцтва? Хрэньнікаў на гэта адказаў: „раз там рашылі, то правядуць“.

Чарноўскі імкнецца ўпэўніць суд у тым, што ў час гэтай сакрэтнай гутаркі ён яшчэ ня быў членам організацыі.

Крыленка:—для настолькі адкрытай гутаркі між вамі існавала, па крайней меры, пэўная псыхолёгічная прадпасылка?

Чарноўскі:—Так, псыхолёгія ў нас была аднальковая. Хрэньнікаў лічыў мяне сваім чалавекам, які яго ня выдасьць і падтрымае.

Хрэньнікаў, як паказалі далейшыя падзеі, не памыліўся ў Чарноўскім. І калі Хрэньнікаў выбыў з строю, Чарноўскі займае яго пост па кіраўніцтву і напраўленьню шкодніцтва ва ўсёй мэталяапрацоўчай прамысловасьці. Сам Чарноўскі і ў гэтым напрамку імкнецца абмежаваць сваю ролю да рамак простага „інформатара“, які асьведамляў аб відах і дырэктывах ЦК „прампартыі“ шкоднікаў, якія накіроўвалі дзейнасьць паасобных разгалінаваньняў мэталяпрамысловасьці і машынабудаўніцтва. Аднак, даныя абвінавачваньня лёгка перакідаюць і гэтую спробу. Навочная стаўка з Калінынікавым з дакладнасьцю ўстанаўляе, у чым зьмяшчалася сутнасьць работы „інформатара“ Чарноўскага. Гэта ён даваў падрабязныя ўказаньні, як праводзіць у жыцьцё распрацаваны ЦК „прампартыі“ дывэрсыйны пляны, гэта ён паведамляў па ўсёй шкодніцкай сетцы ў мэталяпрамысловасьці парадак, у якім павінны выводзіцца з строю заводы, важныя для абароны краіны. Праўда, ён та сама зьбіраў інфармацыю, а іменна: аб тановішчы мэталяпрамысловасьці. Гэтыя весткі зьбіраліся па заданьню француск̆ага генштабу. Калінынікаў сьведчыць, што пасьля арышту Хрэньнікава, кіруючая шкодніцкая роля ў мэталяпрамысловасьці перайшла к Чарноўскаму.

Калі ў свой час царскі міністар асьветы Кассо парушыў аўтономію вышэйшых навучальных установ, профэсар Чарноўскі адмовіўся даць свой подпіс пад протэстам, у якім выступіла перадавая профэсура. Затое ён вельмі бурна рэагаваў і ахвот а далучыўся да забастоўкі ў 1922 г., калі савецкая ўлада, вымушаная адкрытым сабатажам, прыняла некаторыя меры ў адносінах зацятых прыхільнікаў „чыстаты“ навукі.

Паказаньні падсуднага Купрыянава

Падсудны Купрыянаў расказвае суду кароткія біграфічныя весткі аб сваім жыцьці. Купрыянаў за 22 гады службы да лютаўскай рэволюцыі зрабіў вялікую кар'еру. Апошнія 17 год з 1900 г. да 1917 г. ён працаваў на прадпрыемстве, якое належала вядомаму прамыслоўцу Канавалаву, зараз аднаму з актыўных дзеячоў „Гандальпрому“. Ад становішча загадчыка аднэй з фабрык Канавалава, інжынэр Купрыянаў даслужыўся да высокага паста кіраўніка групай канавалаўскіх фабрык з гадовым акладам у 12000 р.

„Асабістых адносін з Канавалавым у м я н е ня было“, — адказвае падсудны на пытаньне дзяржаўнага абвінаваўцы тав. Крыленка. Аднак, пазьней Купрыянаў вымушан быў прызнаць, што сустракаўся з Канавалавым у „недзелавой абстаноўцы“.

Антыўнага супраціўленьня кастрычнікавай рэволюцыі Купрыянаў не аказаў, калі ня лічыць... удзелу ў сабатажы і адмаўленьня ад работы ў савецкіх організацыях. Спачатку нэпу падсудны паяўляецца ў ВСНГ. У пэрыод 22-24 году працуе ў тэкстыльных трэстах, а потым атрымлівае назначэньне ў якасьці дырэктара баваўнянай прамысловасьці ў адпаведным дырэктарыяце ВСНГ. Нарэшце, у 1928 годзе Купрыянаў становіцца загадчыкам вытворчага кіраўніцтва НТС, фактычным вяршыцелем вытворчых лёсаў усёй сындыцыраванай баваўнянай прамысловасьці нашага Саюзу. Вось кароткая біографічная афарбоўка гэтага кіраўніка, дырыжэра шкодніцкіх актаў тэкстыльнай прамысловасьці.

Купрыянаў пачаў „адчуваць“ шкодніцтва яшчэ ў пачатку 1925 году; актыўна пачаў прымаць удзел у шкодніцкай групе інжынэраў-тэкстыльшчыкаў у канцы 1925 году. У гэтую групу Купрыянава завербаваў ужо неаднокраць упамінаны на процэсе Лапацін,—бліжэйшы памоцнік Канавала і братоў Рябушынскіх. Па заяве Купрыянава, першыя крокі шкодніцтва ў тэкстыльнай прамысловасьці выражаліся, галоўным чынам, у сьвядомым ігнораваньні плянаваньня, няправільным выдаткаваньні бавоўны, а таксама ў стварэньні штучнага разрыву між вытворчасьцю і збытам.

Цесны контакт тэкстыльнай групы і „цэнтру“ ажыцьцяўляўся праз другога падсуднага, Фядотава. Грошай за шкодніцкую дзейнасьць Купрыянаў да 1927 году не атрымліваў. Лапацін ад імя Канавалава, на падставе старой яго даверанасьці, атрымаў ні многа, ні мала, як на паўмільёна рублёў у замежнай валюце, якую рэалізаваў на чорнай біржы.

Купрыянаву ў 1929 годзе было даручана „ЦК прампартыі“ організаваць у цэнтральным апараце НТС і яго аддзяленьнях на мясцох ячэйкі з служачых, былых белых афіцэраў, для аказаньня „надзейнай дапамогі інтэрвэнтам“. К таму ж Купрыянаву даручалася ўтварыць ячэйкі ў асяродзьдзі студэнцтва. Праўда ён гэтага даручэньня ня выканаў, ня з прычыны нежаданьня, а з прычыны немагчымасьці. За выключэньнем адзінак, савецкае студэнцтва не пашло на вудачку гэтых прадажных шкоднікаў.

Натхніцель інтэрвенцыі бандыт Пуанкарэ

Заваёвы Кастрычніка не аддамо!

Заслухаўшы інформацыю аб шкодніцкай дзейнасьці „Прамысловай партыі“, мы, колгасьнікі колгасу імя Дзяржынскага Лагойскага раёну—вітаем АДПУ, які раскрыў гэтую шайку здраднікаў і шпіёнаў і просім узнагародзіць АДПУ ордэнам Леніна. Патрабуем прымяніць да шкоднікаў вышэйшую меру пакараньня—расстрэл.

На шкодніцтва мы адказваем шчырым згуртаваньнем сваіх шэрагаў вакол ленінскай партыі, узьняцьцем працдысцыпліны і вытворчасьці. Аддаем свой аднадзённы заробак для пабудовы дырыжабля імя „Колгасаў Беларусі“. Апрача таго, колгас уносіць з агульных сродкаў на гэтую мэту 25 рублёў. Усе колгасьнікі ўступаюць у ТД-Авіохэм. У дапамогу політвязьням аддаем 2-дзённы заробак МОПР'у.

Заваёвы Кастрычніка не аддамо!

Прэзыдыум сходу.

У адказ інтэрвэнтам узмацняем фонд абароны краіны

У адказ на работу контррэволюцыйнай організацыі прампартыі, у адказ усім імпэрыялістычным бандытам, якія падрыхтоўваюць інтэрвэнцыю ў СССР, моладзь колгасу імя Дзяржынскага, першага прыгараднага сельсавету (Менскага) заяўляе, што яна ўся ўступае ў ячэйку ТД-Авіохэму для вывучэньня ваеннай справы, каб заўсёды быць гатовай абараніць заваёвы Кастрычніка, і ўносіць у фонд абароны краіны—20 рублёў.

Шабуневіч В. В.

Сурова пакараць агентаў польскага фашызму

(Пастанова агульнага сходу рабочых ф-кі „Кастрычнік“)

Заслухаўшы інформацыю аб выкрыцьці органамі ДПУ контр-рэволюцыйнай групы буржуазных інтэлігентаў беларускіх нацыянал-дэмократаў, агульны сход рабочых швэйнай фабрыкі „Кастрычнік“ лічыць усю іх дзейнасьць адной з праяў агульнае атакі сусьветнай контр-рэволюцыі на адзіную ў сьвеце дзяржаву працоўных, краіну дыктатуры пролетарыяту.

Сход лічыць, што беларускія нац. дэмократы на чале з Ластоўскім, Лёсікам, Некрашэвічам і інш. таксама як і ўдзельнікі выкрытай „промпартыі“ выконвалі волю сусьветнай буржуазіі, сусьветных ворагаў працоўных.

Яны імкнуліся стварыць Беларусь фашысцкую, адабраць фабрыкі і заводы ад рабочых, зямлю ад беларускага бедняцка-серадняцкага сялянства і зьвярнуць усё гэта былым фабрыкантам і абшарнікам.

У цеснай сувязі з вялікадзяржаўнай расійскай контр-рэволюцыяй і з польскім фашызмам, яны імкнуліся аднавіць капіталістычны лад жыцьця ў нашай краіне, рыхтавалі крывавую расправу над працоўнымі Савецкай Беларусі.

ДПУ паклала канец падрыўной дзейнасьці контррэволюцыянэраў.

Вітаючы ДПУ,—зоркага вартаў[...] заваёў Кастрычніка, сход патра[...] самай суровай кары агідным лё[...] польскага фашызму і сусьветнай ко[...] рэволюцыі.

Сход у адказ на выступленьне [...]шых клясавых ворагаў заклікае [...] рабочых павысіць сваю кляса[...]дбайнасьць, напружыць усе сілы [...] пасьпяховае выкананьне пяцігод[...] няўхільнае выкананьне прамфінпл[...]

Сход заклікае ўсіх рабочых [...] рашучую барацьбу з вялікадзяр[...]ным расійскім шовінізмам як з [...]най небясьпекай, з беларускім ко[...] рэволюцыйным нацыянал-дэмокра[...]мам і з шовінізмамі ўсіх колераў.

Сход патрабуе карэннага палепш[...]ня і пашырэньня работы па белар[...]зацыі на фабрыцы, разгортваньня [...]рокай інтэрнацыянальна - выхаваў[...] працы сярод рабочых.

Няхай жыве КП(б)Б—адзіны [...]нізатар працоўных мас Савецкай [...]ларусі.

Няхай жыве ленінская нацыя[...]ная політыка!

Прэч агентаў сусьветнай конт[...]волюцыі і польскага фашызму—[...]рускіх нацыянал-дэмократаў.

Няхай жыве беларуская куль[...] нацыянальная па форме і пролетар[...] па зьместу!

Шкоднікаў рабочага забясьпечаньня—да адказнасьці

23 лістапада ў памяшканьні БПТ адбыўся паказальны суд над б. студэнтам Менскага Белпэдтэхнікуму, Ракам Андрэем. Рак, будучы старшынёю прафкому БПТ, скарыстаў сваю пасаду для асабовых мэт. Застаўшыся ў час летніх вакацый у тэхнікуме. Рак нейкім чынам дастаў мандат кооп. упаўнаважанага Хвастовіча і з гэтым мандатам атрымліваў талёны на дэфіцытныя тавары, якія належалі студэнтам БПТ. Рак атрымаў на студэнцкі к-ў прымус, блюзку і іншыя рэчы і прысвоіў іх.

У пачатку верасьня г. г. Рак атрымаў талёны на дэф. тавары. Замест таго, каб разьмеркаваць іх сярод студэнтаў-пайнікаў на кооп. крамнай камісіі, ён, ня будучы сябрам апошняй, узяўся сам надзяляць сваіх блізкіх. Апрач таго, што студэнтам ён даваў па 2 та[...] на абутак (напрыклад Біруву) [...] яшчэ і такім асобам, якія ня ме[...] якіх адносін да студэнцкага [...] Так, рахункавод Парткевіч атр[...] 3 талёны на абутак, Грушэвіч А[...] не пайнік МЦРК атрымала 1 тал[...]

Рак напісаў у МЦРК адносіны [...] права атрыманьня балетак і забя[...]чыў імі сваіх сваякоў у Слуцку.

Партыйная і комсамольская [...] БПТ кваліфікавала гэты ўчын[...]яўнае шкодніцтва ў рабочым за[...]печаньні. Рак быў выключан з ка[...]датаў партыі і комсамолу.

Народны суд першага вуча[...] разглядзеўшы гэтую справу, пры[...]рыў Рака да 8 месяцаў прымус[...] працы. Рак зьяўляецца студ[...] БДУ—яму там ня месца. ХВА-В[...]

Паведамленьне

Сёньня, 1-га сьнежня, а 7-ай гадзіне ўвечары, у памяшканьні бел. аддзяленьня рэд. газ. „Комсамольская Праўда“ Савецкая, 61) адбудзецца нарада ячэйкавых упаўнаважаных па комсамольскай працы.

Яўка ўпаўнаважаных на нараду абавязкова.

1 сьнежня, а 6 гадзіне ўвечары, у памяшканьні дому Комсамолу (Комсамольская, 25) адбудзецца пашыраны пленум ФРК ЛКСМБ.

Парадак дня: 1. Інформацыя ЦК ЛКСМБ, 2. Інформацыя ячэе[...] ходзе падрыхтоўкі да IX і X з[...] ЛКСМ.

1 сьнежня, а 6-й гадзіне ўвеч[...] у памяшканьні Кастрычніцкага [...] РК КП(б)Б адбудзецца пасяджэ[...] пленум Кастрычніцкага РКЛК[...] сумесна з сакратарамі ячэек.

Парадак дня: 1. Інформацы[...] ЛКСМБ; 2. Бягучыя справы.

Яўка сяброў РК і сакрат[...] ячэек абавязкова.

Сакратар РК ЛКСМБ—Каўн[...]

АДКАЗНЫ РЭДАКТАР—РЭДКОЛЕГІЯ

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускай ССР з жалем паведамляе аб нечаканай сьмерці 30 лістапада г. г. у гор. Менску кандыдата ў члены ЦВК БССР—калгасьніка

ГОВАРА, ЛАРЫЁНА БАЗЫЛЁВА,

і выказвае сваё спачуваньне сям'і памершага, і сельска-гаспадарчай арцелі імя XI-годзьдзя Кастрычнікавай рэвалюцыі, актыўным работнікам якой быў памершы

Згублены

— Комсам. біл. за № 132[...] на імя Вярхоўца С., выд. Чач[...]кім РК КСМ.

— Кооперацыйная кніжка № 7346, на імя Грынгла[...] выд. Плешчаніцкім спажыв. т[...]

— Профсаюзны білет, на Сьляпяна Г. Я., выд. ЦП [...] друкароў.

Комсам. біл. за № 85601, на Валуева Пятр., выд. Менскім КСМ.

Друкарня імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599